# СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ

**На нашай зямлі нарадзіліся людзі, якія справамі сваімі і творчасцю праславілі нашы мясціны.**



**Сярод іх Міхаіл Мікалаевіч Ганчарык, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі, член-карэспандэнт АН БССР, доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР. нарадзіўся 12 лістапада 1899 года ў вёсцы Кляннік Смалявіцкага раёна ў сялянскай сям'і.**



**Таленавіты чалавек, сапраўдны патрыёт, пісьменнік-празаік Мікола Нікановіч. Нарадзіўся ў 1902 годзе ў хаце, якая зараз знаходзіцца побач са школай і ў якой доўгі час пражывала пляменніца М.Нікановіча Ленартовіч З.С. Творчасць**



**Нікановіча, яго грамадская дзейнасць разгортвалася ў 30-х гадах, калі пачыналіся рэпрэсіі ў краіне. У 1933 годзе быў арыштаваны як "вораг народа". У 1944 годзе прапаў без вестак у Чэхаславакіі. Справу служэння свайму народу, сваёй Радзіме, пачатую Нікановічам, прадоўжылі яго родныя. Мастацкі талент М.Нікановіча перададзены ў спадчыну яго ўнучатай пляменніцы, самабытнай мастачцы і паэтэсе Я.А. Дзяркач.**

## Дзяржаўная ўстанова адукацыі
**"Кляннікі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад - базавая школа" Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці**

*Адсюль, ад школьнага парога*
*У жыццё вядуць усе дарогі.*
*І школа ў часавай дарозе*
*Стаіць у веку на парозе.*
**Кручкоўская З.Дз.**

## Крэда школы:
## "Школа - радасці дом"



*Тут кожнай справай, кожным крокам*
*нас вучаць Чалавекам быць…*

Установа размешчана ў
аг.Кляннік, які знаходзіцца за 26 км
на паўднёвы ўсход ад г.Смалявічы
т. (01776) 42-237; Klennik11@mail.ru



## Наша ўстанова сёння



- Мікраараён школы - 6 населеных пунктаў



- Колькасць вучняў - 41, колькасць дзяцей у групе дзіцячага сада - 11



- Колькасць настаўнікаў і выхавальнікаў - 15 (з іх 11 з першай і вышэйшай катэгорыяй)



- Працуюць пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, музей,спартыўная зала, сучасны камп'ютарны клас



- Выкладанне ўсіх прадметаў ажыццяўляецца на беларускай мове



- З 2000 г. школа працуе па турысцка-краязнаўчым профілі



- У школе арганізавана работа прадметных факультатываў, аб'яднанняў, па інтарэсах дзейнічае турклуб "Выток"



- У школе створана і актыўна дзейнічае пярвічная аргаізацыя ГА "БРПА"

## Наша жыццё















## Школьны музей




Музей быў адкрыты ў Кляннiцкай школе ў лiпенi **1985** года. Iнiцыятарамi стварэння музея выступiлi дырэктар школы Валерый Васiльевiч Жылянiн, былы камандзiр партызанскай брыгады "Разгром" Павел Цiмафеевiч Клявакiн i сакратар Савета ветэранаў брыгады "Разгром" Валянцiн Пятровiч Яцкевiч.



Экспазiцыя школьнага музея мае **11** раздзелаў, дзе прадстаўлены пiсьмовыя фонды, рукапiсныя фонды, рэчыўныя матэрыялы, вялiкая колькасць фотаздымкаў розных гадоў, у тым лiку i ваенных, копii i кнiгi былых партызан. У асноўным фондзе **400** прадметы.



За гады работы музей наведала больш за **5** тысяч чалавек, праведзена **392** мерапрыемствы, больш **400** экскурсiй.



У музеi ёсць этнаграфiчны куток, якi быў адкрыты ў **2004** годзе. Некаторым экспанатам ужо больш за сто гадоў.